## *ГІСТОРЫЯ*

*УДК 930(476)(1921–1939)*

*А. С. ГОРНЫ*

# БЕЛАРУСКІЯ ПАЛАНАФІЛЬСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ І КУЛЬТУРНЫМ ЖЫЦЦІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1937 гг.): ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы*

*(Паступіў у рэдакцыю 06.05.2014)*

Гісторыя Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы – адна з самых цікавых і ў той жа час супярэчлівых старонак беларускай гісторыі. Вывучэнню грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця гэтага рэгіёна прысвечаны шматлікія манаграфіі і навуковыя артыкулы як беларускіх, так і замежных даследчыкаў. Нягледзячы на гэта, некаторыя пытанні заходнебеларускай рэчаіснасці на сённяшні дзень застаюцца маладаследаванымі. Сярод іх – пытанне дзейнасці беларускіх паланафільскіх партый і арганізацый, якія ў міжваенныя гады выступалі за цеснае супрацоўніцтва з інстытутамі польскай дзяржавы дзеля дасягнення пэўных палітычна-культурных саступак для беларускай меншасці. Дадзеная праблематыка на сённяшні дзень не мае спецыяльнага даследавання ў гістарыяграфіі. Разам з тым, яна ў той ці іншай ступені закраналася ў працах, прысвечаных палітычнай і сацыяльнай гісторыі Заходняй Беларусі.

Першыя спробы даследавання беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі былі зроблены яшчэ ў міжваеннае дваццацігоддзе. У гэты перыяд у БССР была апублікавана пэўная колькасць артыкулаў і кніг, у якіх разглядаліся розныя аспекты грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця заходнебеларускіх зямель. Асноўная ўвага ў гэтых публікацыях, якія пераважна мелі публіцыстычны і прапагандысцкі характар, надавалася асвятленню нацыянальнага ўціску беларусаў у Польскай дзяржаве, а таксама дзейнасці беларускіх левых і левардыкальных груп. На старонках прац міжваеннага перыяду сустракаюцца звесткі і пра некамуністычны беларускі рух у Польшчы, у тым ліку фрагментарна адлюстравана дзейнасць беларускіх паланафільскіх арганізацый. Адной з першых публікацый, у якой згадваюцца паланафілы, можна лічыць артыкул «Сучасная Польшча і Заходняя Беларусь», надрукаваны ў зборніку «Заходняя Беларусь» у 1925 г. Аўтар артыкула змясціў невялікую інфармацыю аб утварэнні ў Заходняй Беларусі паланафільскай Часовай Беларускай Рады. У публікацыі адмоўна характарызуюцца кіраўнікі гэтай арганізацыі, падкрэсліваецца, што яны служылі польскім уладам і былі «гарачымі прыхільнікамі польскіх злотых» [1, с. 28–29]. Крытычныя матэрыялы аб дзейнасці Часовай Беларускай Рады змешчаны ў разгорнутых артыкулах У. Каліноўскага і Б. Вансоўскага пра грамадска-палітычнае жыццё Заходняй Беларусі [2; 3]. Так, У. Каліноўскі сцвярджаў, што Рада была створана польскім Міністэрствам унутраных спраў дзеля палітычнай дэзарганізацыі беларускага насельніцтва ў Польшчы [2, с. 104]. У публікацыі Б. Вансоўскага адзначалася, што паланафільская арганізацыя з’яўлялася паслядоўніцай «бандыцкага “Зялёнага Дуба”, а яе галоўнымі мэтамі лічыліся стварэнне бачнасці паланафільскага руху і барацьба з камуністычным уплывам на беларускае палітычнае жыццё ў Польшчы [3, с. 207].

Як вядома, у канцы 1920 – пачатку 1930-х гг. у грамадска-палітычным жыцці БССР назіраліся працэсы згортвання палітыкі беларусізацыі і распаўсюджвання тэорыі т. зв. «нацыянал-дэмакра-

тызму». Гэтыя падзеі адмоўна адбіліся не толькі на палітычных працэсах у краіне, але і на развіцці гістарычнай навукі ў цэлым. Асабліва негатыўна гэта паўплывала на навуковую распрацоўку заходнебеларускай тэматыкі. У гэты няпросты перыяд у Заходняй Беларусі з ліку былых дзеячаў Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады (БСРГ) сфарміравалася паланафільская група (група Луцкевіча-Астроўскага, альбо «беларуская санацыя». – *А. Г.*), якая пачала шукаць кампрамісы з санацыйным урадам Пілсудскага. Публіцыстыка ў савецкай Беларусі разгарнула кампанію па абвінавачванню гэтай групы ў сувязях з «польскім фашызмам». Паступова выпрацоўвалася ідэя існавання «беларускага нацыянал-фашызму», галоўнай сілай якога лічылася група Луцкевіча-Астроўскага [4]. Больш таго, у савецкім беларускім друку пачало актыўна падкрэслівалацца, што «беларуская санацыя» ў Заходняй Беларусі і «нацыянал-дэмакраты» ў БССР маюць агульныя карані і цесна звязаны між сабой ідэалагічна [5, с. 90].

Такія тэндэнцыі ў ацэнцы дзейнасці беларускіх паланафілаў яскрава прасочваюцца ў матэрыялах зборніка артыкулаў «Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине», які быў выдадзены ў 1935 г. пад рэдакцыяй члена бюро ЦК КПЗБ С. Мертэнса (С. Скульскага). Так, аўтар артыкула «Белорусская санация» М. Левін, знаходзячыся пад уплывам тагачасных ідэалагічных клішэ, абвінавачваў групу Луцкевіча-Астроўскага ў «стварэнні шпіёнскіх арганізацый у савецкай Беларусі», бачыў яе галоўную мэту ў мабілізацыі заходніх беларусаў на «барацьбу супраць сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР» [6, с. 284, 289]. Тым не менш, у артыкуле прыведзены шэраг аб'ектыўных даных, якія адлюстроўвалі генезіс групы Луцкевіча-Астроўскага, раскрывалі яе палітычную платформу і арганізацыйную працу ў Заходняй Беларусі. Нават нягледзячы на выразную палітызаванасць дадзенай працы, яна да сённяшняга часу застаецца найбольш поўным даследаваннем па гісторыі «беларускай санацыі» ў 1930-х гг. Некаторыя звесткі з артыкула актыўна запазычваліся іншымі даследчыкамі, асабліва ў пасляваенны перыяд развіцця гістарычнай навукі.

У разглядзе гістарыяграфіі міжваеннага часу патрабуюць асэнсавання працы, якія былі апублікаваны ў Заходняй Беларусі. Іх аўтарамі з'яўляліся непасрэдныя ўдзельнікі і лідары беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы. Так, некаторыя сведчанні аб дзейнасці беларускіх паланафілаў сустракаюцца ў кнізе А. Станкевіча «Беларускі хрысціянскі рух» [7, с. 538–540]. Аўтар падкрэсліваў, што беларускае паланафільства ніколі не прадстаўляла адзінага палітычнага кірунку, а з'яўлялася «палітыканствам» асобных дзеячаў і «лакейскім угодніцтвам» [7, с. 538]. Інтарэс для ўсебаковага раскрыцця вывучаемай праблемы прадстаўляе брашура Ф. Акінчыца «Чаму гэта так сталася?» [8]. У ёй змяшчаюцца цікавыя звесткі пра ўмовы фарміравання групы Луцкевіча-Астроўскага ў Заходняй Беларусі і ролі ў гэтым працэсе былых лідараў БСРГ.

У канцы 1930 – пачатку 1950-х гг. існавала пэўнае табу на вывучэнне заходнебеларускай палітычнай гісторыі па прычыне забароны дзейнасці КПЗБ у 1938 г. і разгорнутых рэпрэсій супраць яе членаў. Але ў другой палове 1950-х гг., на думку даследчыка А. Савіча, адбыўся гістарыяграфічны паварот у вывучэнні Заходняй Беларусі, які быў выкліканы рэабілітацыяй КПЗБ падчас ХХ з'езда КПСС [9, с. 45]. Гэта спрыяла разгортванню шырокіх даследаванняў праблем палітычнай гісторыі заходнебеларускіх зямель у міжваенны перыяд. Адкрыліся магчымасці для значнай актывізацыі навукова-даследчай працы. Былі абаронены дысертацыі, падрыхтаваны манаграфіі і артыкулы у якіх аўтары на падставе новага дакументальнага матэрыялу прааналізавалі многія маладаследаваныя праблемы гісторыі рэвалюцыйнага і нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі. Аднак у гэтых працах падкрэслівалася выключная роля камуністаў у арганізацыі нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі, перабольшваўся ўзровень рэвалюцыйнасці працоўных мас і не надавалася належная ўвага некамуністычным грамадска-палітычным рухам. Дзейнасць беларускіх паланафільскіх арганізацый толькі фрагментарна закранадася ў некаторых працах гэтага перыяду. Сярод паланафілаў савецкія гісторыкі найбольш часта ўзгадвалі групу Луцкевіча-Астроўскага, што было звязана з ранейшай дзейнасцю яе лідараў у БСРГ. Напрыклад, у даследаваннях А. Мацко і Г. Ватковіча «беларуская санацыя» ацэньвалася як «буржуазна-нацыяналістычная група», якая праводзіла ў Заходняй Беларусі «здрадніцкую і антынародную дзейнасць» [10, с. 170–171; 11, с. 14]. Больш грунтоўнае вывучэнне гісторыі групы Луцкевіча-Астроўскага было праведзена У. Палуянам [12, с. 95–96,

238–239]. Гісторык прааналізаваў палітычную праграму «беларускай санацыі», раскрыў уплыў групы Луцкевіча-Астроўскага на дзейнасць Таварыства беларускай школы і іншых беларускіх арганізацый Заходняй Беларусі. Як і папярэднікі, У. Палуян лічыў «беларускую санацыю» нацыяналістычнай групоўкай, якая імкнулася завесці грамадска-палітычнае жыццё беларусаў у Польшчы ў рэчышча палітыкі «згодніцтва і буржуазнага культурніцтва» [12, с. 123, 239]. Нельга пакінуць без увагі даследаванні гісторыка У. Ладысева. Так, у працах «Шлях да свабоды» і «В борьбе за демократические права и свободы» даследчык адным з першых у пасляваеннай гістарыяграфіі звярнуў увагу на дзейнасць у Заходняй Беларусі паланафільскай Часовай беларускай рады і такіх паланафілаў, як П. Аляксюк, В. Адамовіч і А. Паўлюкевіч [13, с. 37; 14, с. 149]. Акрамя гэтага, гісторык прааналізаваў арганізацыйную працу групы Луцкевіча-Астроўскага па стварэнні Цэнтрасаюза і Таварыства беларускай асветы ў Заходняй Беларусі, закрануў пытанне ўдзелу «беларускай санацыі» ў парламенцкіх выбарах 1930 г. у Польшчы [13, с. 70–71; 14, с. 155–157]. Тым не менш, інфармацыя аб беларускіх паланафілах у даследаваннях савецкіх гісторыкаў мела агульны характар і не закранала многія аспекты праблемы (напрыклад, дзейнасць мясцовых структур паланафільскіх арганізацый ці супрацоўніцтва паланафілаў з польскімі спецслужбамі). У 1950–1980-я гг. у беларускай савецкай гістарыяграфіі так і не з'явілася ніводнага грунтоўнага і абагульняючага даследавання, цалкам прысвечанага дзейнасці беларускіх паланафільскіх арганізацый.

У канцы 1980 – пачатку 1990-х гг. назіраецца станаўленне новага этапу ў гістарыяграфіі Заходняй Беларусі. Даследчыкі адмовіліся ад манаполіі марксісцкай метадалогіі і пачалі больш крытычна разглядаць грамадска-палітычныя працэсы ў гістарычнай рэтраспектыве. Адкрыццё новых і раней недаступных архіўных дакументаў дазволіла гісторыкам пераасэнсаваць многія старонкі барацьбы беларусаў за нацыянальнае самавызначэнне ў міжваеннай Польшчы. Крытычна стала ацэньвацца дзейнасць асобных партый і рухаў. З'явіліся публікацыі, у якіх раскрываліся невядомыя раней аспекты гісторыі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Таварыства беларускай школы і інш. Аднак дзейнасць беларускіх паланафілаў па-ранейшаму не стала прадметам спецыяльных даследаванняў. У комплексных і абагульняючых працах па гісторыі Беларусі, выдадзеных у апошні час, увогуле адсутнічаюць згадкі пра беларускія паланафільскія арганізацыі 1920-х гг. (Краёвая сувязь, Арганізацыя беларускіх беспартыйных актывістаў, Часовая Беларуская Рада, Цэнтральны камітэт па беларускіх справах, «група Ф. Умястоўскага» і інш.). Напрыклад, у шасцітомнай «Гісторыі Беларусі» толькі некалькі абзацаў было прысвечана аналізу дзейнасці групы Луцкевіча-Астроўскага [15, с. 413–414]. Арганізацыйную працу «беларускай санацыі» і яе ўзаемаадносіны з польскімі ўладамі таксама асвятляюць гісторыкі У. Ладысеў і П. Брыгадзін у кнізе «Паміж Усходам і Захадам. Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.)» [16, с. 183–184]. У дадатку да манаграфіі аўтары апублікавалі нават вытрымкі з мемарыялу, які быў пададзены сябрамі групы Луцкевіча-Астроўскага прэзідэнту Польшчы летам 1930 г. [16, с. 298]. Тым не менш, на сённяшні дзень, акрамя названых матэрыялаў, у беларускай гістарыяграфіі адсутнічаюць грунтоўныя даследаванні, у якіх вывучаюцца праблемы генезісу і дзейнасці «беларускай санацыі», Цэнтрасаюза і Таварыства беларускай асветы.

У пачатку 2000-х гг. асобныя аспекты гісторыі беларускіх паланафільскіх арганізацый у Заходняй Беларусі знайшлі пэўнае адлюстраванне ў шэрагу навуковых прац. Першынство ў гэтым кірунку належыць гісторыкам А. Пашкевічу і А. Чарнякевічу. У артыкуле «Беларускія паланафільскія арганізацыі і дзеячы падчас парламенцкіх выбараў у Польшчы ў 1922 г.» А. Пашкевіч прааналізаваў дзейнасць Дзяржаўнага аб'яднання на крэсах і Аб'яднання беларускіх беспартыйных актывістаў і «Зялёнага дуба», паказаў ролю гэтых арганізацый у выбарчай кампаніі сярод беларускага насельніцтва Польшчы ў 1922 г. [17, s. 161–164]. Больш шырока праблему ўдзелу беларускіх паланафілаў у парламенцкіх выбарах 1922, 1928 і 1930 гг. даследчык раскрыў у сваім дысертацыйным даследаванні [18, л. 25–27, 73, 92–98 ]. На думку А. Пашкевіча, нізкая падтрымка паланафілаў на выбарах сведчыла пра відавочную маргінальнасць паланафільскага напрамку беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі [17, s. 164].

Шэраг праблем дзейнасці беларускіх паланафілаў асветлены ў працах А. Чарнякевіча [19; 20; 21; 22]. На падставе аналізу раней невядомых дакументаў, выяўленых у польскіх і літоўскіх

архівах, гісторык закрануў некаторыя пытанні генезісу паланафільскага кірунку ў беларускім руху, дзейнасці паланафільскага Цэнтральнага камітэта беларускіх спраў і Часовай Беларускай Рады. Даследчык ахарактарызаваў асобныя палітычныя акцыі паланафілаў, выявіў супярэчлівыя стасункі паміж лідарамі паланафільскіх арганізацый. Акрамя гэтага, прадметам даследавання А. Чарнякевіча стала малавывучаная праблема супрацоўніцтва паланафілаў з польскімі спецслужбамі. У артыкуле «Ад супрацоўніцтва да здрады: беларускі рух і II аддзел Польскага Генеральнага штаба 1919–1939 г.» гісторык вызначыў ролю паланафільскіх дзеячаў у выведвальнай дзейнасці органаў дзяржбяспекі Польшчы, зрабіў спробу аналізу матывацыі, якая штурхала паланафілаў супрацоўнічаць з дэфензівай [19]. На наш погляд, цікавымі таксама ўяўляюцца некаторыя ацэнкі А. Чарнякевіча, звязаныя са стэрэатыпнымі ўяўленнямі сучаснікаў адносна беларускага паланафільства. Так, даследчык заўважыў, што паняцце «паланафіл» у грамадска-палітычным дыскурсе Заходняй Беларусі змяшчала адразу некалькі стэрэатыпных катэгорый – чалавек без прынцыпаў, авантурыст і агент польскіх спецслужбаў [23, s. 80].

Некаторыя аспекты дзейнасці беларускіх праўрадавых арганізацый у Заходняй Беларусі закрануў у сваіх даследаваннях А. Вабішчэвіч. У яго манаграфіі «Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939)» дадзена характарыстыка дзейнасці паланафільскіх культурна-асветніцкіх арганізацый «Прасвета», Цэнтрасаюз і Таварыства беларускай асветы. У працы ў агульным плане вызначана іх месца ў грамадска-культурным жыцці беларусаў міжваеннай Польшчы [24, с. 45–46, 58–60]. Тым не менш, комплекснае асэнсаванне дзейнасці культурных арганізацый паланафілаў у даследаванні не праводзілася.

Пэўную ўвагу адзначанай праблематыцы на сучасным этапе надавалі і іншыя даследчыкі гісторыі Заходняй Беларусі. Напрыклад, у артыкуле «Польска-літоўскі канфлікт і роля ў ім беларускіх палітычных партый і арганізацый (1920 – 1923 гг.)» гісторык І. Коўкель прааналізаваў месца паланафільскай «Краёвай сувязі» ў палітыцы польскіх улад па вырашэнню «беларускага пытання» ў Сярэдняй Літве [25, с. 268–269]. Палітычную праграму беларускай сялянскай партыі «Зялёны дуб» і яе прапольскую арыентацыю даследавала Н. Стужынская [26, с. 75–85]. Цікавыя звесткі аб дзейнасці беларускай студэнцкай паланафільскай карпарацыі «Скарынія» прысутнічаюць у манаграфіі В. Крывуця «Молодежные организации на территории Западной Беларуси (1929–1939 гг.)» [27, с. 123–127]. Гісторык А. Сідарэвіч раскрыў ролю А. Луцкевіча ва ўтварэнні і дзейнасці групы Луцкевіча-Астроўскага [28].

У апошні час з'явіўся шэраг публікацый, прысвечаных дзейнасці асобных дзеячаў паланафільскага лагера. Былі зроблены спробы вывучыць жыццёвыя шляхі такіх паланафілаў, як П. Аляксюк [29], В. Адамовіч [30], Я. Ладноў [31] і інш. Аднак, нягледзячы на тое, што аўтары дадзеных прац уводзяць у навуковы ўжытак раней невядомыя факты, асобныя моманты жыцця гэтых людзей засталіся па-ранейшаму не асветленымі з-за недахопу крыніц асабістага паходжання.

Пытанні дзейнасці беларускіх паланафільскіх арганізацый у той ці іншай ступені былі аб'ектам даследавання і ў польскай гістарыяграфіі. Ужо ў 1920–1930-я гг. у Польшчы былі выдадзены першыя працы, прысвечаныя тагачаснаму партыйнаму жыццю краіны. Гэтыя публікацыі былі насычаны цікавай фактурай і мелі не столькі навукова-аналітычны, колькі асветніцка-папулярны характар. Напрыклад, інфармацыя агульнага плана пра Часовую Беларускую Раду была змешчана ў брашуры А. Белцыкоўскай «Палітычныя партыі ў Польшчы: папулярны палітычны даведнік» [32, s. 29]. Больш падрабязна асэнсаваць палітычнае жыццё беларусаў у Польшчы імкнуўся П. Трэйдэньскі, які ў сваім артыкуле, апублікаваным у 1930 г., разгледзеў дзейнасць беларускіх палітычных партый, у тым ліку і паланафільскіх [33, s. 514–520]. Даследчык падкрэсліў, што беларуска-польскія палітычныя і культурныя ўзаемаадносіны ў XIX – пачатку XX ст. стварылі падставы для фарміравання ў беларускім руху паланафільскага кірунку. Тым не менш, на думку П. Трэйдэнскага, паланафільскія арганізацыі ў Заходняй Беларусі (Часовая Беларуская Рада і Беларуская радыкальна-народная партыя Ф. Умястоўскага) мелі слабы ўплыў на беларускае насельніцтва і не змаглі выйсці на першы план палітычнага жыцця па прычыне канфліктаў паміж сабой [33, s. 514].

Неабходна падкрэсліць, што ў міжваеннае дваццацігоддзе да беларускага нацыянальнага руху значную цікавасць праяўлялі розныя дзяржаўныя ведамствы Польшчы і ў першую чаргу –

спецслужбы. Іх супрацоўнікі апублікавалі шэраг аналітычных прац, сярод якіх змястоўнасцю вылучаецца «Кароткі нарыс беларускага пытання» [34]. Напісаны афіцэрамі II аддзела Генеральнага штаба Войска Польскага (польскай дэфензівы) для службовага карыстання, нарыс змяшчае каштоўныя аналітычныя сведчанні аб гісторыі беларускага нацыянальнага руху, грамадска-палітычным жыцці беларусаў у БССР, Літве і Польшчы. У кнізе змешчаны звесткі аб дзейнасці Краёвай сувязі, Арганізацыі беларускіх беспартыйных актывістаў, Часовай Беларускай Рады, Цэнтральнага камітэта па беларускіх справах, прыводзяцца факты ўзаемных кантактаў паланафілаў з уладамі, раскрываецца фінансавая і палітычная залежнасць паланафільскіх арганізацый ад урадавых структур Польшчы. Аўтары «Кароткага нарыса беларускага пытання» падкрэслівалі, што кіраўнікі беларускіх паланафільскіх арганізацый, на якіх рабілі стаўку ўлады, былі не столькі надзейнымі палітыкамі, колькі авантурыстамі і кар'ерыстамі і гэта было галоўнай прычынай палітычных няўдач паланафілаў. «Разняволены індывідуалізм, хваравітыя амбіцыі людзей, якія не дараслі да заняцця падобнага роду пасад, – такія былі рысы гэтых псеўдадзеячаў, якіх закранула плямай расійскай рэвалюцыі і з якімі нам выпала пачаць працу», – адзначалі супрацоўнікі польскіх спецслужбаў [34, с. 101].

На сучасным этапе праблема дзейнасці беларускіх паланафілаў у Заходняй Беларусі набыла ў польскай гістарыяграфіі больш канцэптуальнае асвятленне. Гэтай тэматыкай пачалі займацца як уласна польскія гісторыкі, так і прадстаўнікі беларускай меншасці ў Польшчы. Так, у 1994 г. быў апублікаваны артыкул Я. Вапы, прысвечаны ўтварэнню Цэнтральнага саюза беларускіх культурна-асветных і гаспадарчых арганізацый (Цэнтрасаюза) [35]. Гісторык падкрэсліў значную ролю групы Луцкевіча-Астроўскага ў фармаванні Цэнтрасаюза і раскрыў удзел гэтай арганізацыі ў парламенцкіх выбарах 1930 г. Аднак дадзены артыкул фактычна толькі ўзняў праблему дзейнасці Цэнтрасаюза ў Заходняй Беларусі, пакідаючы іншым даследчыкам багатае поле для аналітыкі.

Вывучэннем гісторыі беларускіх праўрадавых арганізацый у Заходняй Беларусі займалася польская даследчыца К. Гамулка [36]. Яна прапанавала ўласную класіфікацыю беларускіх палітычных партый у Заходняй Беларусі, вызначыўшы тры палітычныя плыні: прапольскую, незалежніцкую і савецкую. На думку даследчыцы, прапольская плынь узнікла ў 1919 г. і праіснавала ў Заходняй Беларусі амаль усё міжваеннае дваццацігоддзе, але выйсці на першы план беларускага палітычнага жыцця так і не змагла. Да гэтай плыні гісторык адносіла тыя палітычныя сілы, якія імкнуліся захаваць добрыя стасункі з польскімі ўладамі [36, s. 63]. Ахарактарызаваўшы беларускія паланафільскія партыі і арганізацыі, К. Гамулка прыйшла да высновы, што ўсе яны вызначаліся сваёй палітычнай слабасцю і вузкай грамадскай базай [36, s. 73]. Аднак трэба заўважыць, што даследчыца пры вырашэнні вывучаемага пытання ў асноўным грунтавалася на дакументах польскага паходжання.

Дзейнасць беларускай паланафільскай арганізацыі Краёвая сувязь у Сярэдняй Літве стала прадметам даследавання польскіх гісторыкаў М. Галэндака [37, s. 99–101] і І. Янушэўскай-Юркевіч [38, s. 204–214]. Даследчыкі ўвялі ў навуковы ўжытак шэраг раней малавядомых дакументаў, акцэнтавалі ўвагу на польскай палітыцы адносна беларусаў у Сярэдняй Літве і ролі ў ёй паланафілаў, вызначылі супярэчлівыя ўзаемаадносіны польскіх улад і Краёвай сувязі. Акрамя гэтага, Янушэўская-Юркевіч у манаграфіі «Нацыянальныя стасункі на Віленшчыне ў 1920–1939 гг.» прааналізавала асобныя бакі дзейнасці не толькі Краёвай сувязі, але і Часовай Беларускай Рады, Цэнтрасаюза і інш. [39, s. 630–632, 634–635].

Некаторыя звесткі аб дзейнасці беларускіх паланафілаў змяшчаюцца ў працах іншых польскіх гісторыкаў. Так, В. Папроцкая ў артыкуле «Беларускія грамадска-культурныя арганізацыі на ўсходніх крэсах II Рэчы Паспалітай» вызначыла асноўныя кірункі дзейнасці Таварыства беларускай асветы [40, s. 12–13]. Агульная інфармацыя пра Часовую Беларускую Раду прысутнічае ў манаграфіі М. Куркевіча [41, s. 95–98]. Я. Трачук ахарактарызаваў паланафільскія перыядычныя выданні ў анатаваным спісе беларускамоўнай перыёдыкі міжваеннай Польшчы [42]. Вехі жыцця аднаго з актыўных удзельнікаў беларускага паланафільскага руху Г. Канапацкага былі прадстаўлены на старонках кнігі Р. Бергера [43]. З апошніх даследаванняў трэба узгадаць манаграфію Ю. Грыбоўскага, дзе (у нарысе пра беларускае палітычнае жыццё ў міжваеннай

Польшчы) асвятляецца і дзейнасць беларускіх праўрадавых арганізацый [44, s. 68–70]. Даследчык вызначыў, што паланафільскі кірунак беларускага руху сфарміраваўся падчас польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. На думку Ю. Грыбоўскага, паланафілы не змаглі стварыць канкурэнцыю беларускім радыкальным групоўкам, а разлікі польскіх улад з дапамогай паланафільскіх арганізацый вырашыць «беларускае пытанне» ў Заходняй Беларусі зайшлі ў тупік. «Адсутнасць падтрымкі беларускага насельніцтва для паланафілаў была абумоўлена тым, што рэчаіснасць на кожным кроку кампраметавала абвешчаныя імі (паланафіламі. – *А. Г.*) лозунгі», – прыйшоў да высновы гісторык [44, s. 70].

Варта заўважыць, што, нягледзячы на наватарскія падыходы і значную актуальнасць прац польскіх даследчыкаў, амаль усе яны засноўваюцца на матэрыялах уласна польскага паходжання. Сведчанні з беларускіх крыніц у іх выкарыстоўваюцца не дастаткова поўна, што робіць даследаванне абмежаваным.

Такім чынам, праблема дзейнасці беларускіх паланафільскіх арганізацый у Заходняй Беларусі па-ранейшаму далёка ад вычарпальнасці ў гістарыяграфіі. На сённяшні час не створана комплексных і грунтоўных прац, прысвечаных развіццю паланафільскага напрамку ў беларускім нацыянальным руху. Існуючыя навуковыя напрацоўкі стварылі толькі падмурак для далейшага даследавання. У гістарыяграфіі ўвогуле адсутнічае нават азначэнне тэрміна «беларускае паланафільства» і яго крытэрыяў, што стварае пэўныя цяжкасці ў вызначэнні той ці іншай арганізацыі ці дзеяча як паланафільскіх. Маладаследаванымі застаюцца пытанні, звязаныя з фінансаваннем беларускага паланафільства, выданнем беларускай паланафільскай прэсы, жыццём і лёсам многіх паланафілаў. Таксама да гэтага часу існуюць пэўныя цяжкасці ў ацэнцы самой з'явы беларускага паланафільства. Як заўважыў А. Савіч, сучаснаму даследчыку неабходна разабрацца, што ёсць «паланафільства» – цяжкі пошук кампрамісу ці свядомы шлях да канфрантацыі? [9, с. 187].

Крыніцазнаўчая база па праблеме дзейнасці беларускіх паланафілаў у Заходняй Беларусі да сённяшняга часу істотна не распрацавана. Па-ранейшаму з'яўляюцца актуальнымі выяўленне і ўвядзенне ў навуковы ўжытак новых крыніц, якія змаглі б раскрыць супярэчныя і малавядомыя пытанні па адзначанай тэме. Разам з тым, даследчыкі на сучасным этапе могуць аперыраваць пэўным комплексам розных дакументаў з айчынных і замежных архіваў, якія дазваляюць у той ці іншай ступені разглядзець некаторыя моманты гісторыі беларускага паланафільства. Безумоўна, галоўнае месца тут належыць пісьмовым крыніцам, якія можна падзяліць на дакументальныя і апавядальныя. Сярод дакументальных крыніц вялікую каштоўнасць маюць дакументы справаводства, якія належалі польскім органам улады, паліцыі і дзяржаўнай бяспекі. У першую чаргу гэта розныя рапарты і даклады польскіх службоўцаў аб стане развіцця беларускага нацыянальнага руху на так званых «крэсах усходніх». Асноўная колькасць гэтай дакументацыі захоўваецца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Літвы, у ф. 15 (Упраўленне Камісара польскага ўрада горада Вільня), ф. 51 (Віленскае ваяводскае ўпраўленне), ф. 53 (Віленскае гарадское староства). У дадзеных фондах знаходзяцца сітуацыйныя справаздачы аб грамадска-палітычным жыцці Вільні і Віленскага ваяводства розных часоў, сакрэтныя лісты і паведамленні паліцыі аб дзейнасці Краёвай сувязі, Часовай Беларускай Рады, Цэнтрасаюза, Таварыства беларускай асветы, агляды паланафільскай прэсы, біяграфічныя даныя лідараў беларускага паланафільскага руху.

Дзейнасць беларускіх паланафілаў у Навагрудскім ваяводстве адлюстравана ў справаводчай дакументацыі, якая захоўваецца ў Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці, у фондах Навагрудскай ваяводскай каменды паліцыі (ф. 662), Навагрудскага ваяводскага ўпраўлення (ф. 551), Нясвіжскай каменды дзяржаўнай паліцыі (641). Перш за ўсё гэта справаздачы польскай паліцыі аб дзейнасці мясцовых аддзелаў Часовай Беларускай Рады і культурна-асветніцкага таварыства «Прасвета» ў Нясвіжскім, Баранавіцкім, Навагрудскім паветах, паведамленні аб удзеле беларускіх паланафілаў у самаўрадавых выбарах 1927 г. і парламенцкіх выбарах 1928 г. у Польшчы. Маючы багаты фактаграфічны матэрыял, дакументы польскага справаводства, тым не менш, адлюстроўвалі ўрадавы пункт гледжання на беларускі нацыянальны рух, не пазбаўлены пэўных суб'ектыўных і кан'юнктурных ацэнак.

Уласная дакументацыя паланафільскіх арганізацый таксама займае важнае месца пры вывучэнні дадзенай праблемы. Гэта пераважна арганізацыйныя статуты, праграмы, пратаколы пася-

джэнняў, мемарыялы, афіцыйныя лісты кіраўнікоў і інш. У адзначаных вышэй фондах Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Літвы захоўваюцца некаторыя дакументы кіруючых органаў Краёвай сувязі, Беларускага грамадзянскага сходу, Цэнтрасаюза. Пэўная колькасць паланафільскай дакументацыі прысутнічае ў ф. 3 Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. У асноўным гэта мемарыялы культурна-асветніцкага таварыства «Прасвета» па пытаннях беларускага школьніцтва і беларусізацыі Праваслаўнай царквы, статуты Камітэта беларускіх спраў, Таварыства беларускай асветы, дакументы Беларускага камітэта ў Варшаве, матэрыялы грамадскага суда паміж лідарамі «беларускай санацыі» А. Луцкевічам і Р. Астроўскім. Разам з тым, большая частка партыйных дакументаў беларускіх паланафілаў пакуль што не выяўлена, што стварае падставы для пошуку гэтага комплексу крыніц як у беларускіх, так і замежных архіўных фондах.

Невялікая частка дакументаў беларускіх паланафілаў была апублікавана ў навуковых часопісах. Польская даследчыца І. Янушэшская-Юркевіч надрукавала рэзалюцыі паланафільскага «з’езда беларускага сялянства Заходняй Беларусі» 1921 г., а таксама дэкларацыю аб утварэнні Краёвай сувязі [38, s. 214–218]. Даступнымі для шырокага кола даследчыкаў сталі вельмі цікавыя рапарты канфідэнта польскай дэфензівы Р. Зямкевіча – вядомага беларускага бібліёграфа і культурнага дзеяча прапольскай арыентацыі [45; 46]. У сваіх рапартах Р. Зямкевіч не толькі змястоўна характарызаваў бягучыя праблемы беларускага грамадска-палітычнага жыцця, але і даваў уласную ацэнку некаторым дзеячам і арганізацыям, у тым ліку і паланафільскім.

Сярод апавядальных крыніц значную цікавасць уяўляе мемуарная літаратура. Напрыклад, звесткі пра паланафілаў прысутнічаюць у кнізе вядомага беларускага пісьменніка і драматурга Ф. Аляхновіча «У капцюрах ГПУ» [47]. Ф. Аляхновіч пэўны час з’яўляўся віцэ-старшынёй паланафільскай Часовай Беларускай Рады, таму ў сваіх мемуарах ён ускосна ўзгадаў пра гэтую арганізацыю і апісаў умовы яе функцыянавання. Пэўную інфармацыю аб нюансах утварэння групы Луцкевіча-Астроўскага і Цэнтрасаюза змяшчаюць апублікаваныя ўласнаручныя паказанні А. Луцкевіча, дадзеныя органам НКУС у 1939 г. [48, с. 258–260], а таксама ўспаміны былога беларускага пасла і сенатара польскага парламента В. Рагулі [49, с. 57–58, 65].

Важнае месца сярод крыніц належыць перыядычнаму друку. Ён з’яўляецца адмысловым відам крыніцы, дзе спалучаюцца матэрыялы як дакументальнага, так і апавядальнага характару. З дапамогай прэсы можна прасачыць развіццё грамадска-палітычнай думкі беларускіх паланафілаў, вызначыць тыя стэрэатыпы, якія прысутнічалі ў беларускім грамадстве адносна паланафільства, вывучыць рознабаковыя напрамкі штодзённай дзейнасці паланафільскіх арганізацый у Заходняй Беларусі. Дзеля гэтага можна выкарыстаць публікацыі як з уласна паланафільскай прэсы («Еднасць», «Родная страха», «Раніца», «Грамадскі голас», «Беларускае слова», «Беларускі радны», «Грамадзянін», «Беларуская хата», «Беларускі дзень», «Наперад», «Народны звон», «Беларускі звон», «Новая варта», «Родны край»), так і з іншых беларускіх і польскіх выданняў («Беларуская крыніца», «Беларускія ведамасьці», «Сялянская праўда», «Сын беларуса», «Беларуская доля», «Беларуская справа», «Маланка», «Сялянская ніва», «Беларускі кліч», «Беларускі фронт», «Przegląd Wileński», «Kurjer Wileński», «Słowo», «Sprawy Narodowościowe»). Большасць гэтых газет і часопісаў захоўваецца ў Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх, Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа.

Падводзячы вынікі, варта яшчэ раз падкрэсліць, што праблема дзейнасці беларускіх паланафільскіх арганізацый у Заходняй Беларусі ў міжваенныя гады патрабуе грунтоўнага і змястоўнага даследавання з выкарыстаннем ранейшых здабыткаў гістарыяграфіі, якое спалучыла б новыя метадалагічныя падыходы і шырокую крыніцазнаўчую базу. Вывучэнне з’явы беларускага паланафільства дапаможа прааналізаваць сучаснаму пакаленню даследчыкаў некаторыя асаблівасці беларуска-польскіх міжнацыянальных узаемаадносін у гістарычнай рэтраспектыве, раскрыць малавядомыя старонкі сацыяльнай і палітычнай гісторыі Заходняй Беларусі. Даследаванне дадзенай праблематыкі дасць магчымасць паўнавартасна асэнсаваць гісторыю нацыянальнага руху і станаўлення беларускай дзяржаўнасці на розных гістарычных этапах і пры супярэчлівых гістарычных абставінах.

## Літаратура


1. *М. С.* Сучасная Польшча і Заходняя Беларусь / М. С. // Заходняя Беларусь: Зборнік. – Менск: БДВ, 1925. – С. 3–30.
2. *Каліноўскі, У.* Політычныя партыі і аб'яднаньні ў сучаснай Польшчы / У. Каліноўскі // Полымя. – 1926. – № 5. – С. 104–106.
3. *Вонсовский, Б.* Политические партии в Польше и Западной Белоруссии / Б. Вонсовский // Западная Белоруссия. Сб. статей. Кн. 1. – Минск: БГИ, 1927. – С. 195–210.
4. *Зоркі, Ан.* Беларускі нацыянал-фашызм / Ан. Зоркі // Зьвязда. – 1929. – № 67. – С. 2–3; № 68. – С. 2–3; № 69. – С. 5.
5. *Некрашэвіч, А.* Беларускі нацыянал-фашызм і яго сабрат беларускі нацыянал-дэмакратызм / А. Некрашэвіч // Бальшавік Беларусі. – 1929. – № 10–12. – С. 83–90.
6. *Левин, М.* Белорусская санация (Луцкевич – Островский) / М. Левин // Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине / Бел. Акад. наук, Комиссия по изучению Западной Белоруссии; под ред. С. Скульского. – Минск: Изд-во Бел. Акад. наук, 1935. – С. 280–289.
7. *Станкевіч, А.* З Богам да Беларусі. Збор твораў / А. Станкевіч – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008. – 1097 с.
8. *Акінчыц, Ф.* Чаму гэта так сталася? / Ф. Акінчыц. – Вільня: Друкарня У. Знамяроўскага, 1931. – 16 с.
9. *Савіч, А. А.* Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гады): гістарыяграфія праблемы: манаграфія / А. А. Савіч. – Брэст: БрДУ, 2012. – 288 с.
10. *Мацко, А. Н.* Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Беларуси против гнета буржуазии и помещиков (1918 – 1939 гг.) / А. Н. Мацко. – Минск: Беларусь, 1972. – 335 с.
11. *Воткович, Г. Б.* КПЗБ в борьбе за интернациональное единство трудящихся (1929–1933 гг.) / Г. Б. Воткович. – Минск: БГУ, 1975. – 128 с.
12. *Полуян, В. А.* Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / В. А. Полуян. – Минск: Наука и техника, 1978. – 360 с.
13. *Ладысеў, У. Ф.* Шлях да свабоды: з гісторыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. / У. Ф. Ладысеў. – Мінск: Голас Радзімы, 1978. – 131 с.
14. *Ладысев, В. Ф.* В борьбе за демократические права и свободы / В. Ф. Ладысев. – Минск: Беларусь, 1988. – 189 с.
15. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2007. – Т. 5: Беларусь у 1917 – 1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 613 с.
16. *Ладысеў, У. Ф.* Паміж Усходам і Захадам. Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. – Мінск: БДУ, 2003. – 307 с.
17. *Пашкевіч, А. В.* Беларускія паланафільскія арганізацыі і дзеячы падчас парламенцкіх выбараў у Польшчы ў 1922 г. / А. В. Пашкевіч // Problemy cywilizacyjnego rozwoju Białorusi, Polski, Rosji i Ukrainy od końca XVIII do XXI wieku / Pod redakcją Piotra Franaszka, Aleksandra N. Nieczuchrina. – Kraków: Wydawnictwo Uniwersytetu Jagiellońskiego, 2007. – S. 161–164.
18. *Пашкевіч, А. В.* Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921–1930 гг.): дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / А. В. Пашкевіч. – Мінск, 2006. – 162 л.
19. *Чарнякевіч, А.* Ад супрацоўніцтва да здрады: беларускі рух і ІІ аддзел Польскага Генеральнага штаба 1919–1939 / А. Чарнякевіч // Гістарычны альманах. – 2007. – Том 13. – С. 13–46.
20. *Czarniakiewicz, A.* Kształtowanie się ośrodka polonofilskiego w białoruskim ruchu narodowym (listopad 1918 – grudzień 1919) / A. Czarniakiewicz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2008. – № 29. – S. 23–90.
21. *Чарнякевіч, А.* Беларускія паланафілы і Грамада. 1925 – пачатак 1927 г. / А. Чарнякевіч // Гістарычны альманах. – 2006. – Том 12. – С. 64–78.
22. *Чарнякевіч, А.* Беларуская Часовая Рада і яе месца і роля ў беларускім нацыянальным руху ў Польшчы сярэдзіны 1920-х гадоў / А. Чарнякевіч // Грамадскія рухі і палітычныя партыі ў Беларусі (апошняя чвэрць XIX – пачатак XXI ст.): матэр'ялы Рэсп. навук. канф. (Гродна, 23–24 кастр. 2008 г.) / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: І. І. Коўкель (адк. рэд.) [ і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2009. – С. 284–292.
23. *Чарнякевіч, А.* Беларускія паланафілы вачамі сучаснікаў: да гісторыі станаўлення стэрэатыпаў / А. Чарнякевіч // Problemy cywilizacyjnego rozwoju Białorusi, Polski, Rosji i Ukrainy od końca XVIII do XXI wieku / Pod redakcją Piotra Franaszka, Aleksandra N. Nieczuchrina. – Kraków: Wydawnictwo Uniwersytetu Jagiellońskiego, 2007. – S. 77–80.
24. *Вабішчэвіч, А. М.* Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст: БрДУ, 2008. – 319 с.
25. *Коўкель, І.* Польска-літоўскі канфлікт і роля ў ім беларускіх палітычных партый і арганізацый (1920–1923 гг.) / І. Коўкель // Беларусіка=Albaruthenica: Кн. 3: Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – С. 259–269.
26. *Стужынская, Н. І.* Беларусь мяцежная: з гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціўлення: 20-я гг. ХХ ст. / Н. І. Стужынская. – Вільня, 2000. – 256 с.
27. *Кривуть, В. И.* Молодежные организации на территории Западной Беларуси (1929–1939 гг.) / В. И. Кривуть. – Минск: Белорус. наука, 2008. – 166 с.
28. *Сідарэвіч, А.* Хроніка пераломнага часу: Антон Луцкевіч як ідэолаг і правадыр нацыянал-фашызму і нацыянал-дэмакратыі / А. Сідарэвіч // Дзеяслоў. – 2004. – № 8. – С. 167–194.
29. *Пашкевіч, А.* «Бацька» беларускіх паланафілаў / А. Пашкевіч, А. Чарнякевіч // Гістарычны альманах. – 2010. – Том 16. – С. 37–58.
30. *Пашкевіч, А. В.* Атаман Дзяргач: невядомыя старонкі біяграфіі, ці да гісторыі палітычнага авантурызму ў беларускім нацыянальным руху / А. В. Пашкевіч, А. М. Чарнякевіч // Берасцейскі хранограф. – 2004. – Вып. 4. – С. 314–334.

31. *Чарнякевіч, А. М.* Міністр БНР: дзіўныя шляхі Яўгена Ладнова / А. М. Чарнякевіч // Личность в истории: героическое и трагическое: сборник материалов Пятой междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 20-летию историч. ф-та, Брест, 23–24 ноября 2011 г. / БрГУ им. А. С. Пушкина: редкол.: М. Э. Чесновский (гл. ред.) [и др.]. – Брест: БрГУ, 2012. – С. 243–249.
32. *Bełcikowska, A.* Stronnictwa polityczne w Polsce: popularny przewodnik polityczny / A. Bełcikowska. – Warszawa, 1926. – 32 s.
33. *Trejdeński, P.* Białoruskie stronnictwa polityczne w Polsce i ich ideologja / P. Trejdeński // Sprawy Narodowościowe. – 1930. – № 5 – 6. – S. 513–543.
34. Кароткі нарыс беларускага пытаньня. – Мінск: Логвінаў, 2009. – 396 с.
35. *Wappa, E.* Okoliczności powstania Centralnego Związku Białoruskich Organizacji i Instytucji Kulturalno-Oświatowych («Centrasajuzu») i jego udział w wyborach 1930 r. / E. Wappa // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 1994. – № 1. – S. 63–72.
36. *Gomółka, K.* Białoruskie partie i organizacje prorządowe w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 1997. – № 7. – S. 63–74.
37. *Gałędek, M.* Ocena działalności białoruskich organizacji politycznych w świetle tajnych raportów polskich struktur rządowych na Litwie Środkowej / M. Gałędek // Wyzwolenie czy okupacja? Stosunek społeczności zamieszkujących pogranicze polsko-litewsko-białoruskie do zmieniających się w XX wieku systemów państwowych. Redakcja Marek Kietliński, Wojciech Śleszyński. – Białystok, 2006. – S. 89–103.
38. *Januszewska-Jurkiewicz, J.* Dwie «krajowe» inicjatywy białoruskie na Litwie Środkowej / J. Januszewska-Jurkiewicz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2001. – № 16. – S. 197–218.
39. *Januszewska-Jurkiewicz, J.* Stosunki narodowościowe na Wileńszczyźnie w latach 1920–1939 / J. Januszewska-Jurkiewicz. – Katowice: Wyd. Uniwersytetu Śląskiego, 2010. – 710 s.
40. *Paprocka, W.* Białoruskie organizacje społeczno-kulturalne na Kresach Wschodnich w II Rzeczypospolitej / W. Paprocka // Etnografia Polska. – 1999. – T. XLIII. – Z. 1–2. – S. 11–20.
41. *Kurkiewicz, M.* Sprawy białoruskie w polityce rządu Władysława Grabskiego / M. Kurkiewicz. – Warszawa: Neriton, 2005. – 132 s.
42. *Traczuk, J.* Prasa białoruska w II Rzeczypospolitej (1918–1939) / J. Traczuk // Studia polono-slavica-orientalia. – 1992. – T. XIII. – S. 185–373.
43. *Berger, R.* Hassan Konopacki – Tatar, muzułmanin, bydgoszczanin / R. Berger. – Warszawa: Stowarzyszenie Jedności Muzułmańskiej, 2011. – 111 s.
44. *Grzybowski, J.* Pogoń między Orłem Białym, Swastyką i Czerwoną Gwiazdą. Białoruski ruch niepodległościowy w latach 1939–1956 / J. Grzybowski. – Warszawa, 2011. – 908 s.
45. *Michaluk, D.* «Jestem przyjacielem Białorusinów...» – raporty wywiadowcze Romualda Ziemkiewicza do II Oddziału Sztabu Generalnego WP z lat 1922-1923 / D. Michaluk // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2006. – № 26. – S. 233–258.
46. *Czerniakiewicz, A.* Raporty Romualda Ziemkiewicza z lat 1923–1925 / A. Czerniakiewicz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2007. – № 27. – S. 224–275.
47. *Аляхновіч, Ф.* У капцюрах ГПУ / Ф. Аляхновіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – 283 с.
48. *Луцкевіч, А.* Да гісторыі беларускага руху / А. Луцкевіч. – Вільня-Беласток: Беларусакае гістарычнае таварыства, Інстытут беларусістыкі, 2010. – 346 с.
49. *Рагуля, В.* Успаміны / В. Рагуля. – Мінск: ВЦ «Бацькаўшчына», 1993. – 96 с.

*A. S. GORNY*

**BELARUSIAN POLONOPHILIC ORGANIZATIONS IN THE SOCIO-POLITICAL AND CULTURAL LIFE OF WESTERN BELARUS (1921–1937): HISTORIOGRAPHY AND SOURCES OF PROBLEMS**

## Summary

Basic achievements of historiography in studies of the problems concerned to activities of Belarusian polonophilic organizations in Western Belarus (1921–1937) have been considered in the article. As a result of Belarusian and Polish historians works analysis it has been revealed that defined problem is fragmentary and not enough deeply studied. The informative research preparation using new methodological approaches is still relevant. It would reveal all the fields of Belarusian polonophilic organizations activities in Western Belarus. Additionally the sources related to the history of Belarusian polonophilia have been analyzed. Most of them are the documents from archives of Belarus and Lithuania. In present time the important part of the polonophile documentation is not identified that provides a basis for active searches of these interesting complex sources in the domestic and foreign archives.